управления начало оказывать влияние на характер псковского летописания, и в XVII веке проявилось в полной мере. С 20-х годов XVII века более подробными и регулярными становятся сообщения, содержащие информацию о должностных лицах, в том числе не из высших управленческих кругов. Ряд сообщений, вероятно, полностью построены на делопроизводственном материале и сводятся к простому перечислению имен и занимаемых должностей. Летописи приобретают характер вторичного источника информации и начинают утрачивать актуальность.

1. Псковская первая летопись // Полное собрание русских летописей. – Т. 5. Выпуск 1. Псковские летописи. – М.: Языки славянской культуры, 2003. – 256 с.

2. Псковская третья летопись // Псковские летописи. Выпуск второй. – Москва : Издательство АН СССР, 1955. – 364 с.

3. Аракчеев В.А. Власть прошлого : Очерки истории и культуры Псковской земли в XIII-XIX веках. / В.А. Аракчеев. – Псков : обл. тип., 2012. – 320 с.

4. Насонов А.Н. Летописи псковские / Н.А. Насонов // ПСРЛ. Т. 5. Выпуск 1. Псковские летописи. – М.: Языки славянской культуры, 2003. – 256 с.

5. Насонов А.Н. О списках псковских летописей / Н.А. Насонов // ПСРЛ. Т. 5. Выпуск 1. Псковские летописи. – М.: Языки славянской культуры, 2003. – 256 с.

## ПОЛЬСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МЕНШАСЦЬ У БССР ПА МАТЭРЫЯЛАХ УСЕСАЮЗНЫХ ПЕРАПІСАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА СССР 1926, 1937, 1939 гг.

***Пыж Д.С.,***
*магістрант БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік –* ***Козік Л.А.,*** *канд. гіст. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Польская нацыянальная меншасць, БССР, ўсесаюзны перапіс насельніцтва.

Keywords. Polish national minority, BSSR, nationwide census survey.

Гістарычныя карані польскай нацыянальнай меншасці на тэрыторыі Беларусі і неабходнасць пабудовы ўзаемаадносін паміж людзьмі розных этнічных супольнасцяў, а таксама паміж гэтымі супольнасцямі і дзяржавай абумовілі значнасць абранай тэмы. Даследаванне дазваляе супаставіць статыстычныя звесткі, дзякуючы чаму можна ўсталяваць сістэмныя змены ў дэмаграфічных паказчыках.

Мэта даследавання – прасачыць дынаміку польскага народанасельніцтва па дадзеных усесаюзных перапісаў 1926, 1937, 1939 гг.

**Матэрыялы і метады.** У працы выкарыстоўваліся матэрыялы усесаюзных перапісаў насельніцтва СССР 1926, 1937, 1939 гг. Была праведзена праца як над першаснымі дадзенымі, прадстаўленымі архіўнымі матэрыяламі, так і над агрэгаванымі статыстычнымі крыніцамі.

У даследаванні ўжываліся агульнанавуковыя (аналіз і сінтэз, аналогія і параўнанне, абагульненне), спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны) і колькасныя метады

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паводле усесаюзнага перапісу насельніцтва 1926 г., колькасць польскага насельніцтва вылічвалася па дадзеным з графы "народнасць". У "Настаўленні аб тым, як пісаць адказы на пытанні асабістага лістка", адзначалася, што ў адказах на гэтае пытанне не варта замяняць народнасць рэлігіяй, грамадзянствам і г. д. У выпадку, калі рэспандент не мог даць адказ, то перавага павінна была аддавацца народнасці маці [3, с. 3].

Па дадзеным перапісу 1926 г. у СССР налічвалася 782 тыс. прадстаўнікоў польскай нацыянальнай меншасці, што складае 0,5 % усяго насельніцтва краіны. У БССР жа налічвалася 97 498 палякаў, з іх 46 139 чалавек – мужчыны і 51 359 – жанчыны, што складае каля 2 % насельніцтва БССР [10, л. 300-302, 7, с. 3]. Гэта з'яўляецца самым вялікім паказчыкам да агульнай колькасці насельніцтва краіны ў параўнанні з іншымі рэспублікамі СССР. Найвышэйшы працэнт польскага насельніцтва (да 3-5 %) адзначаўся ў Барысаўскім і Мінскім акругах, найменшы – на ўсходзе і паўднёвым усходзе рэспублікі [1, с. 20].

Паводле перапісу 1926 г. у гарадах БССР пражывала 19 665 палякаў (8584 мужчын і 11 081 жанчын), а ў сельскай мясцовасці – 77 833 палякаў (40 278 мужчын і 37 555 жанчын) [10, л. 294-296, 306-308]. Такім чынам, гарадское насельніцтва сярод палякаў складала каля 20 %, сельскае – каля 80 %.

Асаблівую цікавасць выклікае пытанне вызначэння роднай мовы. У выданні Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення СССР пазначалася, што "пад роднай мовай цяпер не разумеецца абавязкова мова, якая паказвае на паходжанне асобы, а тая мова, якая цяпер для гэтай асобы замяняе родную, г. зн. мову, якой ён лепш за ўсё валодае ці на якой звычайна кажа" [8, с. 19]. Дадзеныя перапісу паказалі, што 37 % (36 046 чалавек) палякаў у БССР карысталася польскай і 47,9 % (42 751 чалавек) – беларускай мовай [11]. 17 179 палякаў карысталася рускай мовай, на іншых мовах размаўляла 1419 палякаў, не пазначылі мову пры перапісу 103 чалавека [9, л. 8-10]. Увага да вызначэння менавіта роднай мовы ў перапісу 1926 г., а не нацыянальнай прыналежнасці, вяла да скажэння рэальных дадзеных. Нягледзячы на гэта, дадзеныя перапісу 1926 г., з улікам іх крытычнага аналізу, з'яўляюцца каштоўнай дэмаграфічнай крыніцай.

Па дадзеным усесаюзнага перапісу насельніцтва 1937 г. колькасць палякаў у БССР склала 119 881 чал., што на 20 тыс. чал. больш у параўнанні з перапісам 1926 г. [12, с. 94].

У перапісу 1937 г. тэрмін народнасць замяняецца тэрмінам нацыянальнасць. У перапісным лісце з'яўляецца новая графа: для запаўнення дадзеных аб рэлігіі. Такім чынам, існуе верагоднасць падмены нацыянальнай прыналежнасці чалавека яго рэлігійнай прыналежнасцю [2, с. 8–13].

Выкарыстоўваць дадзеныя перапісу 1937 г. трэба з асцярогай. Як сведчыць апублікаваная ў Мінску ў 1936 г. брашура ў дапамогу брыгадам перапісу, апошняя разглядалася як "масавая палітычная праца" і павінна была канстатаваць вялікія поспехі СССР, у тым ліку ў росце народанасельніцтва [12, с. 4].

Падчас правядзення Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1939 г. было ўлічана наяўнае насельніцтва з вылучэннем часова пражываючых, а таксама часова адсутнае насельніцтва. Улік часова адсутных і часова пражываючых азначаў, па сутнасці, адначасовы перапіс і наяўнага, і пастаяннага насельніцтва [6, с. 17].

Сёмы і восьмы пытанні перапісу тычыліся нацыянальнасці і роднай мовы. У адказ на сёмае пытанне запісвалася нацыянальнасьць, да якой прылічаў сябе апытваны. Дзеці да 16 гадоў пры адсутнасці ў іх запісу нацыянальнасці ў перапісным лісце, прыпісваліся да нацыянальнасці бацькоў, калі ў бацькі і маці была запіс адной і той жа нацыянальнасці. У адказ на восьмае пытанне, таксама як і на пытанне аб нацыянальнасці, запісвалася назва мовы, якую сам апытваны лічыў сваёй роднай мовай. Роднай мовай для дзяцей, якія яшчэ не ўмеюць гаварыць, запісвалася мова, на якой звычайна размаўляюць у сям'і. Варта адзначыць, што ў дадзеным перапісу, у адрозненні ад папярэдняга перапісу 1937 г., адсутнічае пытанне аб рэлігійнай прыналежнасці, што выключае магчымасць падмены нацыянальнасці рэлігійнай прыналежнасцю [6, с. 31-32; 4, с. 32-33].

Агульная колькасць насельніцтва БССР у 1939 г. склала 5 568 994 чал. [13, с. 9]. З яго 58380 чал. – палякі, што складае ўсяго 1,1 % насельніцтва рэспублікі. 17 952 палякаў пражывала ў горадзе, 40428 чалавек - у сельскай мясцовасці. Больш за ўсё палякаў было ў Магілёўскай (14122 чал.), Палескай (12213 чал.) і Віцебскай (11515 чал.) абласцях [5, с. 70-71].

**Заключэнне.** Паводле дадзеных перапісу 1926 г колькасць палякаў на тэрыторыі БССР склала 97,5 тыс. чал., 1937 г. – 119,9 тыс. чал., 1939 г. – 58,4 тыс. Такім чынам, мы бачым рэзкае ўзрастанне колькасці насельніцтва да 1937 г. і рэзкае яго памяншэнне да 1939 г. Зыходзячы з гэтага мы можам ставіць пад сумненне дадзеныя перапісу 1937 г. і выказаць здагадку аб наўмысным завышэнні яе вынікаў. Рэзкае памяншэнне колькасці палякаў па дадзеных перапісу 1939 г. можна растлумачыць як бояззю насельніцтва запісвацца палякамі з-за вялікай колькасці рэпрэсаваных, так і іх фізічным знішчэннем з прычыны рэпрэсіўнай палітыкі савецкай улады 1937-1938 гг.

У ходзе разгляду праблемы дынамікі колькасці польскага народанасельніцтва ў БССР было выяўлена, што асноўнымі прычынамі скажэння рэальных дадзеных з'яўляюцца замена пытання аб нацыянальнасці дадзенымі аб веравызнанні і мове, а таксама наўмыснае або ненаўмыснае скажэнне перапісчыкамі інструкцый перапісаў.

1. Белорусская Советская Социалистическая Республика. – Минск: Издание СНК БССР, 1927. – 528 с.
2. Бланкі і падручнікі для шчотчыка ў сельскіх мясцовасцях. – Мінск: горліт, 1937. – 30 с.
3. Всесоюзная перепись населения 1926 г. Наставление о том, как писать ответы на вопросы личного листка / СССР, БССР, ЦСУ. – Минск: типография профтехшколы, 1926. – 6 с.
4. Всесоюзная перепись населения 1939 г. – Челябинск: Челябинское областное издательство, 1938. – 42 с.
5. Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги / Российская академия наук; редкол.: Ю. А. Поляков [и др.]. – Москва: Наука, 1992. – 256 с.
6. Всесоюзная перепись населения 1939 года: (Методология и организация проведения переписи и разработки итогов). – 2-е переработ. и доп. изд. - М.: Госстатиздат, 1957. – 164 с.
7. История Беларуси (краткий очерк) / М. П. Костюк [и др.]; под общ. ред. М. П. Костюк. – Минск: Экоперспектива, 2002. – 205 с.
8. Михайловский, В. Г. Всесоюзная перепись населения 1926 года: Рекомендуется в качестве материала по проведению переписи населения / В. Г. Михайловский. – Москва: Центр. стат. упр. Союза ССР, 1926. – 28 с.
9. НАРБ. Фонд 30. – Оп. 2. – Д. 6437 т.1. Сведения о населении по полу, грамотности, родному языку по Всесоюзной переписи населения 1926 г.
10. НАРБ. Фонд 30. – Оп. 2. – Д. 6437 т.3. Сведения о населении по полу, грамотности, родному языку по Всесоюзной переписи населения 1926 г.
11. Народность и родной язык населения СССР. – Режим доступа: http://elib.shpl.ru/ru/nodes/16537-vyp-4-narodnost-i-rodnoy-yazyk-naseleniya-sssr-1928. – Дата доступа: 01.09.2021.
12. Усесаюзны перапіс насельніцтва 1937 г.: у дапамогу брыгадам садзейнічання перапісу / Кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчота БССР. – Мінск: Друкарня кіраўніцтва спраў СНК БССР, 1936. – 20 с.
13. Численность населения СССР на 17 января 1939 года. По районам, районным центрам, городам, рабочим поселкам и крупным сельским населенным пунктам. – Режим доступа: http://istmat.info/node/46314. – Дата доступа: 03.09.2021.

## АСАБЛІВАСЦІ АДНАЎЛЕННЯ ЖЫЛЛЁВАГА ФОНДУ г. ВІЦЕБСКА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х гг.

***Пятрэнка Н.А.,***
*аспірант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Космач В.А.,** доктар гіст. навук, прафесар*

Ключавыя словы. Жыллёвы фонд, жыллёвае будаўніцтва, пасляваеннае аднаўленне, г. Віцебск.
Keywords. Housing stock, housing construction, postwar restoration, Vitebsk.

Даследаванне пасляваеннага развіцця гарадоў Савецкай Беларусі ўваходзіць у шэраг актуальных тэм сучаснай гістарычнай навукі. Аднаўленне жыллёвага фонду з'яўлялася важным градафарміруючым фактарам. Мэта артыкула – прааналізаваць асаблівасці і асноўныя накірункі аднаўлення і развіцця жыллёвага будаўніцтва г. Віцебска ў другой палове 1940-х гг.

**Матэрыял і метады.** Пры напісанні артыкула аўтарам прааналізаваны і ўведзены ў навуковы зварот комплекс дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці па акрэсленай тэме. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму, у аснову пакладзены гісторыка-параўнальны і гісторыка-сістэмны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ваенныя дзеянні 1941–44-х гг. нанеслі вялізарныя матэрыяльныя страты г. Віцебску. Значная частка насельніцтва горада была знішчана, аб'екты прамысловасці і камунальна-бытавой інфраструктуры былі ў поўным заняпадзе, засталося меней 7 % ад даваеннага жыллёвага фонду [1, арк. 2]. Пасля вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў жыллёвы фонд быў амаль поўнасцю страчаны, ад 824110 квадратных метраў засталося толькі 57600 [2, арк. 67].

Згодна з дадзенымі Віцебскай гарадской інспектуры стан будынкаў жыллёвага фонду выглядаў наступным чынам: 70.1 % былі поўнасцю знішчаны, 23.5% патрабавалі капітальнага рамонту і толькі 6.4% ацалелі, аднак таксама патрабавалі бягучага рамонту. Агульная плошча знішчэнняў жыллёвага фонду адпавядала стратам уласнасці гарсавета на 94.8 %, ведамаснага карыстання на 92.4%, прыватнай маёмасці на 94.8 % [3, арк. 10]. Поўнасцю зруйнавана – 526 пабудоў (296601 квадратных метраў), часткова разбурана – 1051 будынкаў (38700 квадратных метраў) [4, арк. 18]. Перад кіраўніцтвам горада паўстала задача за кароткі тэрмін ва ўмовах пасляваеннага часу забяспечыць жыллём насельніцтва горада. Акрамя непашкоджанных жылых памяшканняў, першапачаткова